УДК 882.6.09(091)(075.8)

**Д. С. Доўнар**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

# ПЕЙЗАЖ У ТВОРЧАСЦІ ЯНА ЧАЧОТА

**Уводзіны.** Пейзаж — адзін са сродкаў раскрыцця мастацкага свету твора. Гэта не толькі апісанне прыроды, але любой адкрытай прыроды знешняга свету. Адкрыццё пейзажу звязана з усведамленнем новага стану чалавека ў Сусвеце. Асоба ўключана ў бязмерную прастору. У час рамантызму пейзаж суб'ектывуецца, пазней ён выяўляецца па-рознаму: ад простых апісанняў мясцовасці да прынцыпу псіхалагічнага паралелізму, калі ўнутраны стан чалавека прыпадабняецца жыццю прыроды. Найважнейшай часткай мастацкага свету прадстаўнікоў літаратуры Беларусі XIX стагоддзя з'яўляецца пейзаж.

**Асноўная частка.** У беларускай паэзіі склаліся даўнія і значныя традыцыі ў адлюстраванні прыроды, была выпрацавана свая сістэма важнейшых прынцыпаў выяўленчасці і поглядаў на мастацтва пейзажу.

Пейзажная творчасць з'яўляецца высокай, сапраўды эфектыўнай формай мастацкага самараскрыцця асобы і выяўлення адносінаў да навакольнай рэчаіснасці. У дачыненні да паэтычнага пейзажу можна сказаць, што ён уяўляе сабой цэлы мастацкі свет, з якім арганічна звязана кола аўтарскіх думак, уяўленняў і назіранняў. Важнейшай сутнай рысай пейзажу з'яўляецца тып адлюстраванай прасторы, мясцовасці, яе найбольш характэрныя, абагульненыя прыродна-геаграфічныя прыкметы. Нацыянальны пейзаж — тыпавое адлюстраванне беларускай прыроды; экзатычны — карціны і замалёўкі прыроды іншых краін. Неабходна таксама вылучыць ландшафтныя пейзажы (лясны, лугавы, рачны, азёрны, палявы, балотны і т. п.), вясковы і гарадскі (урбаністычны), індустрыяльны, архітэктурны і некаторыя іншыя.

Пейзаж у беларускім літаратуразнаўстве даследаваў Алесь Іванавіч Бельскі. Ён дае класіфікацыю пейзажу паводле творчага напрамку і стылю: «Сентыменталісцкі, рамантычны, рэалістычны, імпрэсіяністычны, імажыніцкі, сімвалісцкі, мадэрнісцкі і некаторыя іншыя» [1, с. 20]. Менавіта сентыменталісцкі, рамантычны віды пейзажу знайшлі сваё праяўленне ў творчасці Яна Чачота. Айчынны даследчык характарызуе кожны з гэтых відаў: «Сентыменталісцкі пейзаж — тып пейзажу, які вызначае эмацыянальна-пачуццёвая паэтызацыя малюнкаў прыроды, сцішанасць фарбаў, ідылічны спакой або сумная настраёвасць» [1, с. 20—21]. Матыў развітання з дзяцінствам заўсёды выражаецца настальгічнымі пачуццямі, якія выкліканы разуменнем, што гэта шчаслівая пара ўжо не вернецца. Малюнкі прыроды, якія паўстаюць у адным з першых вершаў Яна Чачота «Развітанне з Навагрудкам», дакладнымі штрыхамі пазначаюць тое, што выклікае элегічны настрой: *«Бывайце ж вы, лугоў маіх зялёных далі, // Бывай, празрыстай Беразянкі плынь, // Дзе часта мы нырца давалі, // Палохалі ў вадзе зямных багінь», «А неяк смутным днём, пакінуўшы сябрыну, // Сабраў я простых красак палявых // І з сумам да старой капліцы ля рабіны // Пайшоў ўкласці іх — вянком жывым // На дамавіну гожай маладой дзяўчыны, // За штосьці закатаванай бацькам злым»* [3, с. 25—26].

У баладзе «Мышанка» апавядаецца, як узніклі назвы мястэчка Мыш і рэчкі Мышанка. Пра гэта Ян Чачот чуў у гады свайго дзяцінства, калі жыў там. У лірычным адступленні, якое завяршае твор, паэт спявае гімн малой радзіме: *«О мілы ўспамін! Дарагая Мышанка! // Зноў снішся ты ў барве заранак. // Найпершая ў свеце мая ты каханка, // Мільгнуў тут жыцця майго ранак // У чыстым крышталі тваім тут, здзіўлёны, Я бачыў тады пад вадою // Чародку алешын, бор, узгорак зялёны // Сябе — і ўніз галавою»* [3, с. 133]. Берагі Мышанкі, дзе правёў сваё дзяцінства Ян Чочот, уяўляюцца паэту сапраўдным раем. На першы погляд гэты сціплы пейзаж, далёкі ад апісанняў эдэмаўскага саду, які спадабала ўбачыць юродзіваму святому Андрэю, які жыў у сярэдзіне V стагоддзя ў Канстантынопалі, «з бясконцым мноствам птушак, адны з іх мелі крылы залатыя, другія як снег белыя, іншыя пястраць рознымі колерамі» [2, с. 160]. Але калі ўлічыць тэорыю памяці асобы, што распрацавалі на пачатку XX стагоддзя рускі рэлігійны філосаф Л. П. Карсавін і паралельна з ім швейцарскі псіхіятр К. Г. Юнг, то моманты шчасця, якія надыходзяць на чалавека пры ўспамінах маленства, гэта няўмысная згадка, праяўленне архетыпу рая, дзе прайшло дзяцінства чалавецтва.

Для больш трапнага раскрыцця прыроды Ян Чачот ужывае такі лексічны сродак, як метафара: *«Яшчэ без імя ў лясной гэтай цішы // **Рака булькатала** ў асоках»* [3, с. 134]; «*У час, калі **ноч зорны свет расхінае»*** [3, с. 136]. Каб надаць дадатковую мастацкую характарыстыку прыроды, паэт выкарыстоўвае эпітэты: «*О, кожны хацеў бы спаткацца з такою // Пад голлямі **спеўнага гаю**!»* [3, с. 138].

Наступным відам пейзажу, які прадстаўлены ў творах паэта-пачынальніка, з'яўляецца рамантычны. Алесь Іванавіч Бельскі адзначае, што «рамантычны пейзаж — карціна прыроды, адмецінай якой з'яўляюцца

© Доўнар Д. С., 2020

Репозиторий БарГУ

незвычайная экспрэсіўнасць вобразнага мыслення, павышаная эмацыянальнасць, суб'ектыўна-псіхалагічная заглыбленнасць пачуцця. Для гэтага мастацка-стылёвага адлюстравання прыроды характэрна апаведанне высокай і яркай красы, што абумоўлівае выкарыстанне ўзвышанай лексікі, жывапісных сродкаў паэтычнай мовы. У рамантычным пейзажы нярэдка выяўляецца кантраст паміж пачуццямі чалавека і вобразамі, з'явамі прыроды і — як вынік гэтага — абвостраная прага гармоніі, ідэалу» [1, с. 21]. Рамантычны від пейзажу найчасцей сустракаецца ў творах Яна Чачота, стылізаваных пад народную песню, і ў баладах.

Адным з вобразаў беларускага пейзажу, які паўстае ў творах Яна Чачота, з'яўляецца гара. Але нельга сказаць, што дадзены локус ландшафту вызначальны для беларускага пейзажу. У баладзе «Бекеш» два розныя па сацыяльным стане, па маральных якасцях юнакі дабіваюцца шлюбу з прыгажуняй Малгосяй, дачкой валадара Вільні. Стары бацька ставіць звышзадачу перад ахвотнікамі «з самім каралём, а не з кім, парадніцца» — даскочыць да вяршыні шкляной гары, дзе каралеўна павінна выбіць зорку на чале пераможцы. Тры разы спрабуе адважны венгерац трапіць на вяршыню, але сілы прыроды: хмары, шалёны вецер, бура, лівень, навальніца — не дазволілі ўвасобіцца жаданнямі і самога Бекеша, і пана ваяводы: *«Зірнуць не паспелі: ляжаць яны плазам — // І рыцар, і конь нерухома. // Агнём перуновым быў рыцар працяты — Вось так малады і загінуў»* [3, с. 83]. Ліхому чалавеку, парушальніку клятвы, як лічыць Ян Чачот, ніколі не быць на вяршыні гары, дзе, па павер'ях ліцвінаў, жывуць добрыя духі, багі.

У вершы «Плакала бяроза ды гаварыла» Ян Чачот выкарыстоўвае прыём персаніфікацыі. Бяроза скардзіцца на лёс, на няўвагу людзей, якім яна робіць шмат добрага. Белы колер дрэва беларускага пейзажу кантрастуе з чорнай няўдзячнасцю чалавека: *«Плакала бяроза ды гаварыла: // «Ці ж у вас на гэта я заслужыла // Штоб вы мяне парубалі, // І кроў маю высасывалі? // Я вам пры дарозе, як дзеўча, стаю, // Беленька прыбрана, на вёску гляджу, // І хто зімою заблудзіць, // То дарожку пакажу»* [3, с. 44—45].

**Заключэнне.** Пейзаж у творах Яна Чачота дапамагае выявіць асноўную думку твора. У баладах і вершах, дзе раскрываецца замілаванне да прыроды, да мясцін сваіх народзінаў, прадстаўлены сентыменталісцкі від пейзажу. У творах, дзе асуджаюцца чалавечыя заганы, пейзаж кантрастуе з дзеяннямі людзей, аўтар звяртаецца да прыродных стыхій, каб узмацніць пачуццё непрыняцця клятваадступніцтва, абыякавасці, чэрствасці. Для такіх твораў характэрны рамантычны від пейзажу.


**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Бельскі, А. І.* Жывая мова краявідаў: пейзаж у беларускай паэзіі / А. І. Бельскі. — Мінск : Бел. гум. адукац. культ. цэнтр, 1997. — 136 с.
2. *Богословский, М. М.* Душа человеческая = Anima hominis / М. М. Богословский, И. В. Князькин. — М. : Сова, 2006. — 319 с.
3. *Чачот, Я.* Выбраныя творы / Я. Чачот ; уклад, пер. з пол. мовы, прадмовы і камент. К. Цвіркі. — Мінск : Беларус. кнігазбор, 1996. — 374 с.



УДК 821.161.3:821581:82-1"19"



**Ж. В. Косціна**

*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*


## ЛОКУС КУРГАНА Ў ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТАГОДДЗЯ

**Уводзіны.** У артыкуле аналізуецца локус кургана як ландшафтнага рукатворнага аб'екта, які прадстаўнікі літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя ўзнаўляюць у мастацкіх тэкстах, надзяляючы яго метафарычным сэнсам.

Метафарычнасць ператварае локусы ў важнейшыя сродкі эстэтычнага адлюстравання рэчаіснасці ў літаратуры. Паэты і празаікі Беларусі XIX стагоддзя разам з апісаннямі лесу, саду, балота, ракі, возера часта па-мастацку рэпрэзентуюць локус кургана. Ён з'яўляецца характэрным ландшафтным аб'ектам нашай краіны. Адлюстраванне вобраза кургана як рукатворнага аб'екта беларускай культуры сведчыць аб рамантычным мастацкім светапоглядзе Адама Міцкевіча, Яна Баршчэўскага, Уладзіслава Сыракомлі.

**Асноўная частка.** Літаратура Беларусі першай паловы XIX стагоддзя лічыцца пачаткам эпохі рамантызму, які знайшоў сваё прадаўжэнне і ў літаратуры пачатку XX стагоддзя. У гэты перыяд быў закладзены трывалы падмурак для развіцця літаратурных класічных традыцый.

Літаратурная традыцыя складаецца з адзінства канцэптуальнах вобразаў і фармальнага іх увасаблення — галерэі персанажаў, нацыянальных сімвалаў, жанраў і форм мастацкіх твораў.

Сімвалічным сэнсам надзяляецца культурна значымы і сацыяльна засвоены аб'ект навакольнага асяроддзя — локус, для якога «як для прасторавага вобраза, зафіксаванага ў тэксце, важнымі з'яўляюцца прыкметы адноснай тоеснасці існуючаму ў сапраўднай рэальнасці аб'екту і культурнай значнасці гэтага


© Косціна Ж. В., 2020





Репозиторий БарГУ